**Іларыёнава В.С.,** студэнт 314 гр.
Навуковы кіраўнік – Катовіч А.В.

# ТРАНСЛЯЦЫЯ АБРАДАВАЙ КУЛЬТУРЫ Ў КАНТЭКСЦЕ РЭЖЫСЁРСКАЙ ПРАКТЫКІ

Абрад як форма ўвасаблення традыцыйнай культуры практычна ўніверсальны. Гэта адзін з існуючых сродкаў, пры дапамозе якога цэлы комплекс вераванняў носьбітаў гэтай культуры ўвасабляецца ў канкрэтнае дзеянне. У той ці іншы гістарычны перыяд па пэўных прычынах уяўленні чалавека могуць і не атрымаць сімвалічнага і фізічнага афармлення ўвогуле або атрымаць яго аднабаковае выяўленне. «Найбольш важным, найбольш істотным і разам з тым найбольш устойлівым элементам абраду на розных этапах развіцця, – піша І.В. Казакова, – аказваецца яго функцыя. У гісторыі абраду форма яго змяняецца, а функцыя пры гэтым часцей застаецца, хоць часам і тлумачыцца на новы лад» [4, с. 67]. У навуцы, як вядома, ёсць розныя падыходы да класіфікацыі абрадаў, але ў акадэмічнай літаратуры вылучаюцца наступныя абрадавыя цыклы: *каляндарныя, рэлігійныя, аказіянальныя, грамадзянскія, абрады жыццёвага цыкла* [3, с. 15].

Каляндарны цыкл уключае абрады па пэўных рухомых і нерухомых датах народнага календара і падзяляецца на зімовыя, веснавыя, летнія, восеньскія, прымеркаваныя да сельскагаспадарчых работ. Каляндарныя абрады – поліфункцыянальныя. Даследчыкі вылучаюць у іх *магічную, камунікатыўную, цырыманіяльную, гульнявую, геданістычную, эстэтычную абрада-ва-рытуальную,* а таксама *рэлігійную, сатырычную* функцыі [1, с. 46].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адзначым, што правядзенне аказіянальных абрадаў адбываецца пры крытычным становішчы ў грамадстве (крызісныя) ці для магічнага выклікання падобнага крызісу (выкліканне дажджу пры засушлівым надвор‘і), пераадольвання прыроднага, грамадскага ці асобаснага крызісу (антыкрызісныя). Да ліку грамадзянскіх абрадаў адносяцца вытворчыя, сямейныя, дзяржаўныя, палітычныя, прафесійныя. У залежнасці ад складу выканаўцаў грамадзянскія абрады падзяляюцца на *асабовыя, групавыя, абшчынныя*. Па гендэрнай і ўзроставай прыметах вылучаюцца *дзіцячыя, падлеткавыя, маладзёжныя, дзявочыя, жаночыя, мужчынскія* абрады.

У структуры каляндарна-абрадавых дзей фальклор існуе як «комплекс высокапаэтычных вуснамоўных, музычных, танцавальных, гульнявых жанраў, звязаных з земляробчай дзейнасцю, традыцыяй абрадавай карнавалізацыі, маскіравання і травестацыі, які мае шэраг функцыянальных прызначэнняў: *забаўляльнае, эстэтычнае, этычнае, дыдактычнае, маральнае, пазнавальнае, інфарматыўнае, рытуальнае, магічнае, эратычнае, сацыяльнапалавое, узроставае* і інш.» [2, с. 262–263].

Адносна этапаў фальклорна-этнаграфічнай распрацоўкі абраду можна адначыць, што яна ўключае наступныя этапы:

а) гісторыка-рэтраспектыўны аналіз развіцця абраду на аснове вывучэння літаратурных, этнаграфічных і першакрыніц;

б) аналіз сцэнарнага фонду па вызначанай тэматыцы;

в) раскрыццё агульнанацыянальных фрагментаў і рэгіянальна-лакальных асаблівасцей абраду;

г) аналіз трансфармацыі абрадава-рытуальных дзей на розных стадыяльных этапах развіцця традыцыйнай культуры (вызначэнне міфалагічнай праасновы, хрысціянскіх і свецкіх напластаванняў).

На першы погляд можа ўзнікнуць пытанне аб бессэнсоўнасці рэжысуры абрадавай дзеі, якая ў вясковым асяроддзі пабудавана на вопыце

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

многіх пакаленняў, мае свае лакальныя асаблівасці і знаходзіцца ў звыклым для яе выканаўцаў бытаванні. Усім удзельнікам добра вядомы змест і вобразнасць асобных эпізодаў, нормы паводзін і мера імправізацыі. Кожны з іх спачатку быў гледачом, затым удзельнікам, выканаўцам і ўжо потым арганізатарам абраду. Тым не менш, формай трансляцыі і захавання абрадавых практык у сістэме святочнай культуры новага часу адначасова могуць з‘яўляцца працэсы рэстаўрацыі, рэканструкцыі або трансфармацыі рытуальных сегментаў свят [5, с. 18].

Стылізацыя абраду як тып тэатралізаванага прадстаўлення адкрывае шырокі прастор для яго рэалізацыі ў XXI в. У стылізацыі значна ўзрастае роля асобы рэжысёра як мастака-творцы, які не проста зараз ўзнаўляе тое, што існавала ў мінулым, а быццам стварае занава характэрнае для гэтага мінулага. У стылізацыі не толькі абрад аказваецца рэаліяй, але і яго стваральнік-рэжысёр. Пазамастацкая рэальнасць стваральніка ўваходзіць і вынікае з самога фармальнага (формаўтваральнага) прынцыпу стылізацыі. Стылізаваны абрад валодае вялікім выхаваўчым, культурным, мастацкім, арганізацыйным, забаўляльным, відовішчным патэнцыялам. Дачыненне гледача да міфапаэтычнай энергіі абрадавых дзей спалучае мінулае і сучаснае, магічнае і мастацкае, калектыўнае і індывідуальнае.

---

1. Беларусы. Т.10. Славянскія этнакультурныя традыцыі / І.У. Чаквін [і інш.]; рэдкал.: І.У. Чаквін [і інш.]; Нац. акад. навук Беларусі, ІМЭФ імя К. Крапівы. – Мн. : Бел. навука, 2007. – 514 с.

2. Восточнославянский фольклор: словарь науч. и нар. терминологии / редкол.: К.П. Кабашников [и др.] – Мн. : Наука и техника, 1993. – 487 с.

3. Грамадскі быт і культура сельскага насельніцтва Беларусі / В.К.Бандарчык [і інш.]. – Мн. : Навука і тэхніка, 1993. – 253 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Казакова, І.В. Этнічныя традыцыі ў духоўнай культуры беларусаў / І.В.Казакова. – Мн. : Універсітэцкае, 1995. – 150 с.

5. Калачова, І.І. Народныя традыцыі і звычаі выхавання: этнапедагагічная спадчына этнасаў Беларусі / І.І.Калачова. – Мн. : Беларусь, 1999. – 179 с.

**Илларионова В.С.,** студент 314 гр.

Научный руководитель – Котович О.В.

# ТРАДЫЦЫІ АБХОДАЎ
# У КАЛЯНДАРНЫХ ПРАКТЫКАХ БЕЛАРУСАЎ

У кожнага народа спрадвекувёўся свой каляндар, у якім з пакалення ў пакаленнеперадавалісямудрасць, веды, вопытжыццевыхназіранняў. Мелітакікаляндар і беларусы. Багацейшыдухоўны свет нашыхпродкаў, іхнадзвычайныталент, яскраваяфантазія, гумарадбіліся ў абрадах і звычаях, гульнях і песнях, прыкметах і павер'ях.Асобныядні года і наватцэлыяперыядыўстрымалісяселянінам, як сваеасаблівыпаказчык для прыняццятыхціiншых мер у гаспадарчых справах. У пераважнай большасці каляндарных абрадаў беларускага народа абавязковым складнікам былі калектыўныя абходы вёскі. Самай галоўнай ідэяй развіцця абрадавых падзей было злучыць ў адзінае цэлае, якое потым будзе прадуктыўна развівацца. Не сталі выключэнне такія абрады як «Каляды», «Масленіца»,»Тройца». У дадзеным выпадку мы маем справу не толькі з тыпалагічна-блізкімі рытуальнымі дзеяннямі, але і з генетычна-тоеснай ідэяй багоў, якія адказвалі за стан прыроды і становішча ў абшчыне, адно за адным «праходзілі» па вясковай вуліцы, асвячаючы кожны падворак і ўсіх яго дамачадцаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ